УДК 930.2:27

**К. В. Сыцько**
Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»,
вул. Акадэмічная 1, 220072 Мінск, Рэспубліка Беларусь, +375 (017) 284 18 70, kirylawolny@gmail.com

# МАТЭРЫЯЛЫ ПЕРАПІСКІ РЫМСКА-КАТАЛІЦКІХ ПАРАФІЙ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVII — ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ ЯК ГІСТАРЫЧНАЯ КРЫНІЦА

С помощью служебной переписки приходские костёлы в XVII — начале XX века поддерживали организационную связь с деканатами и консисториями. В статье выделяются основные группы корреспонденции обнаруженной автором в приходских учреждениях Римско-католического костёла. Анализируются наиболее частые вопросы, которые решались с помощью переписки. Основными проблемами, затрагиваемыми в письмах, являются функционирование системы учёта и регистрации населения, постройка и ремонт зданий, нарушение священниками правил и норм. Поднимались также имущественные вопросы, давалась оценка эпидемиям болезней, с помощью писем в приходские костёлы проводился розыск пропавших без вести и т. д. Проанализированные в статье источники раскрывают микроисторический аспект функционирования культа и являются ценным материалом в изучении деятельности приходов.

**Ключевые слова:** конфессиональное источниковедение; приход; деканат; консистория; служебная переписка.
Библиогр.: 13 назв.

**K. W. Sytsko**
Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, 1 Akademicheskaya str.,
220072 Minsk, the Republic of Belarus, +375 (017) 284 18 70, kirylawolny@gmail.com

# MATERIALS OF THE CORRESPONDENCE OF THE ROMAN CATHOLIC PARISHES OF BELARUS AT THE END OF XVII — EARLY XX CENTURY AS A HISTORICAL SOURCE

The article deals with the formal correspondence which the priests made with the deans and consistory. The main groups of correspondence, that were found by the author in the parish institutions of the Roman Catholic church, have been singled out. The most frequent issues that were solved through correspondence have been analyzed. The most frequent issues that were mentioned in the correspondence include the functioning of the accounting system and registration of the population, construction and repair of buildings, violation of rules and norms by priests. The sources analyzed in the article reveal the microhistorical aspect of the functioning of the cult and are valuable material to study the parishes activities.

**Key words**: confessional source study; parishes; deanery; consistory; service correspondence.
Ref.: 13 titles.

**Уводзіны.** Гістарычна парафіі з’яўляліся (і з’яўляюцца на дадзены момант) дробнымі арганізацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі Рымска-каталіцкага Касцёла, якія мелі свайго пасярэдніка (ксяндза-пробашча) паміж вернікамі і больш буйнымі арганізацыйнымі структурамі — дэканатам і дыяцэзіяй. У гэтай іерархічнай структуры прысутнічала моцная арганізацыйная сувязь, якая дазваляла ажыццяўляць дзейнасць культавай інстытуцыі на пэўных тэрыторыях. Падобная сувязь падтрымлівалася з дапамогай службовага ліставання. У дадзеным артыкуле разглядаюцца матэрыялы перапіскі канца XVII — пачатку XX стагоддзя, якія захаваліся на сённяшні момант у парафіяльных касцёлах.

**Метадалогія і метады даследавання.** У артыкуле ставіцца мэта паказаць крыніцазнаўчы патэнцыял карэспандэнцыі парафіяльных устаноў. Для яе вырашэння выкарыстоўваліся традыцыйныя спецыяльна-гістарычныя метады (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны,

© Сыцько К. В., 2018

гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны). Асноўны нетрадыцыйны метад, прыменены ў межах даследавання, — палявы маршрутны метад, які заключаецца ў выяўленні і зборы гістарычных крыніц на месцах. Шырока ўжываўся тэкставы аналіз.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Аўтарам у межах археаграфічных экспедыцый выяўлена вялікая колькасць уваходнай карэспандэнцыі, якая храналагічна ахоплівае XVII—XX стагоддзі ў парафіях Жырмуны, Ваўкавыск, Валкалата, Шчучын, Селіванаўцы, Слуцк, Поразава, Ліда, Ішкалдзь, Гродна, Белагруда, Нясвіж, Ішчална і шмат інш. Матэрыялы перапіскі, якія захаваліся ў парафіяльных касцёлах, можна падзяліць на некалькі груп: дзённікі сыходзячай і ўваходнай карэспандэнцыі (да сярэдзіны XIX стагоддзя ў іх упісваўся змест ліста цалкам, пазней — толькі назва); уваходныя лісты ад біскупстваў і кансісторый; уваходныя лісты ад дэканаў; уваходныя лісты ад пробашчаў іншых парафій. Копіі сыходзячых лістоў у парафіях-адрасантах, як правіла, не рабіліся.

Як паказвае аналіз выяўленых гістарычных крыніц, біскупствы (пазней — духоўная кансісторыя) напрамую ліставаліся з пэўнай парафіяй толькі па найбольш тэрміновых пытаннях. Выяўленыя лісты, разасланыя ад імя біскупаў, складаюць невялікую колькасць. Найбольш буйны комплекс матэрыялаў быў выяўлены ў Нясвіжы і складае 22 адзінкі. Змест дадзеных лістоў датычыцца пытанняў надання ксяндзам годнасці каноніка, індульгенцый, індультаў на пабудову капліц і заснаванне брацтваў і г. д. Найбольш раннія ўваходныя лісты біскупаў, выяўленыя аўтарам у парафіяльных установах, адносяцца да другой паловы XVII стагоддзя — гэта разасланыя ад імя Канстанцыя Бжастоўскага ў 1693 годзе заклікі маліцца за перамогу хрысціян над мусульманамі напярэдадні Венскай бітвы, выяўленыя ў архіве Ішкалдскага касцёла [1, арк. 137—137 адв].

Распаўсюджаным варыянтам камунікацыі з'яўлялася адпраўка цыркуляраў, курсорый, прадпісанняў урадавых і духоўных органаў дэканам, якія абавязваліся перадаваць інфармацыю ў выглядзе лістоў ад свайго імя пробашчам. У ліставанні дэканата з парафіяй узнімаліся самыя разнастайныя арганізацыйныя праблемы, сярод якіх можна выдзеліць пытанні метрыкацыі насельніцтва, росшуку зніклых без звестак, кубкавыя зборы, дабрачыннасць, страхаванне касцёлаў, маёмасныя спрэчкі, выкананне прадпісанняў цывільнай улады і шмат інш.

Пераважная большасць матэрыялаў перапіскі звязана з пытаннямі ўліку і рэгістрацыі вернікаў. Так, тэчка з адказамі святароў на лісты Слуцкага дэкана толькі за 1904 год складае 230 лістоў, з якіх 226 звязаны з пытаннямі метрыкацыі. У Ішчальне за 1836 год дадзеныя пытанні адлюстроўваліся ў 10 з 10 лістоў, за 1837 год — 10 з 11, у 1857 годзе — 20 з 23 і г. д. Падобная сітуацыя назіраецца ва ўсіх выяўленых справах у розных парафіях. Як паказвае змест лістоў, падробка метрычных выпісаў і даведак з'яўлялася дастаткова распаўсюджанай з'явай ва ўсіх парафіях Віленскага і Мінска-Магілёўскага біскупстваў. У гэтай сувязі раз на некалькі год, пачынаючы з 1828 года, праводзілася абавязковая праверка метрык на прадмет цэласнасці пячатак і пераплёту. Адной з прычын падробкі называліся шлюбы паміж сваякамі. Аб дадзеным сведчаць, у прыватнасці, лісты, выяўленыя ў Ішкалдскай парафіі за 1827—1834 гады [2, арк. 52а—52б адв.]. У 1904 годзе Слуцкі дэкан патрабаваў ад усіх парафіяльных ксяндзоў выявіць усе метрыкі з пашкоджанай шнуроўкай і сарванымі пячаткамі і перадаць у дэканат, які абавязваўся даставіць дадзеныя матэрыялы ў кансісторыю [3, арк. 14]. Важнай часткай перапіскі паміж дэканатам і парафіямі з'яўляюцца лісты, у якіх спраўджваецца сапраўднасць метрычных дакументаў. З дапамогай дадзеных крыніц можна ўстанавіць парадак унясення запісаў у метрычныя кнігі, а таксама тыя метады і методыкі, якімі кіраваліся святары для выяўлення падробак. Так, у 1904 годзе ксёндз Копыльскай парафіі Віктар Зянкевіч у адпаведнасці з уваходным лістом ад Нясвіжскага дэкана правёў крыніцазнаўчы аналіз запісу аб шлюбе 1871 года В. і І. Станкевічаў і зрабіў вывад, што запіс зроблены «…в свойственном месте приводимой метрической книги одинаковым почерком и чернилами…», як вынік, запіс прапаноўвалася лічыць сапраўдным [3, арк. 43]. У некаторых выпадках ліставанне датычылася

карэкціроўкі метрычных запісаў. Так, бацькі жыхаркі Клецка Ванды Саламеі Іванавай Яржыковіч 1894 года нараджэння звярнуліся да дэкана з просьбай у метрычны запіс аб хрышчэнні дзяўчынкі дадаць імя бацькі, атрыманае ім падчас бежмавання. Канчатковы запіс выглядаў наступным чынам: «Ванда Саламея Іванава Фаміна Яржыковіч» [3, арк. 134].

Нярэдкай прычынай ліставання дэкана і парафіяльных святароў з'яўляюцца пытанні, звязаныя з верыфікацыяй метрычных запісаў. Так, у 1909 годзе ксяндзам Лідскага дэканата быў разасланы ліст, у якім адзначалася, што частка святароў запісвае ў метрычныя кнігі парафій даведкі, выдадзеныя вернікам, якія працавалі ў ЗША, што з'яўляецца парушэннем нормаў Кананічнага права. Даведкі прапаноўвалася правяраць і захоўваць асобна ад метрык, прызнаючы іх сакраментальную моц [4, арк. 2]. Вялікая колькасць лістоў другой паловы XIX стагоддзя датычылася пытанняў міжканфесійных пераходаў вернікаў пэўных парафій. У большасці выпадкаў пробашч даведваўся па факце ад дэкана, што вернік яго парафіі змяніў канфесію на праваслаўную. Ксёндз мусіў выкрасліць асобу з дакументаў парафіяльнага ўліку. У прыватнасці, гэтаму прысвечана вялікая колькасць лістоў за 1860 — 1890-я гады, выяўленых у Валкалацкай, Поразаўскай, Ішчальнскай і іншых парафіях. Да пытанняў метрыкацыі адносяцца таксама перапіска аб запісе польскіх варыянтаў імёнаў у рускай транскрыпцыі, неабходнасці выкарыстоўваць друкаваныя фармуляры метрычных кніг [4, арк. 10] і шмат інш.

Ролю парафіяльных устаноў і іх уплыў на мясцовае насельніцтва адлюстроўвае той факт, што сістэму ўліку і рэгістрацыі касцёлаў, а таксама камунікатыўныя сувязі пробашча і паствы выкарыстоўвалі ў мэтах пошука зніклых без звестак асоб. Так, Ваўкавыскі дэкан разаслаў ў 1874 годзе ліст аб росшуку сялянкі Церашкоўскай (імя не пазначана) з в. Адамавічы, якая сышла ад мужа, і месцазнаходжанне яе было невядома [5, арк. 45 адв.]. У красавіку 1904 года Магілёўская Рымска-каталіцкая кансісторыя разаслала ўсім дэканам з мэтай распаўсюджвання сярод парафіяльных ксяндзоў указ аб росшуку сярод парафіян у кнігах шлюбаў і пахаванняў жывой ці мёртвай Марыі Кунцэвіч, якая сышла з дома некалькі год таму. Дадаткова даваліся прыкметы М. Кунцэвіч — на выгляд 24 гады, валасы і бровы чорныя, нос умераны, твар круглы, рост сярэдні. Апрача прагляду метрычных кніг рэкамендавалася зрабіць трохразовую прамову з амвона аб вышуку дадзенай асобы [3, арк. 157].

Частка лістоў, выяўленых у парафіях, змяшчаюць у сабе інфармацыю аб працоўных правінах мясцовых святароў і рэакцыі на правіны з боку касцельных уладаў. Дадзеныя дакументы дазваляюць аналізаваць найбольш распаўсюджаныя парушэнні касцельных правіл, якія здзяйснялі пробашчы. Самымі частымі з іх былі п'янства і непрыстойныя паводзіны, самавольны сыход з парафіі, адмова ад душпастырства ў парафіі ў сувязі з дрэннымі ўмовамі жыцця. Так, у 1904 годзе Уздзенскі пробашч Вікенці Кушалеўскі быў пазбаўлены права служыць за непрыстойныя паводзіны і сасланы ў Аглонскі дамініканскі кляштар [3, арк. 67], падобны лёс напаткаў Стоклішскага кс. Валянцінаса (імя не пазначана) у 1909 годзе [6, арк. 37]. За самавольнае астаўленне Тамбоўскай парафіі ў 1910 годзе быў пазбаўлены правоў на святадзейства кс. Юліан Матусевіч. Сандамірскі пробашч Яўген Вайцэхоўскі за падобныя дзеянні быў наогул пазбаўлены святарскай годнасці [4, арк. 58]. Шэраг правінаў мясцовых святароў не караўся пазбаўленнем правоў. Сярод іх — пытанні прысвойвання ахвяраванняў, выстаўленне ўласных коштаў за Сакрамэнты, маёмасныя спрэчкі з іншымі ксяндзамі. Так, Лідскі дэкан Гіпаліт Баярунец неаднаразова ліставаў пробашчам з мэтай вызначыць адзіны кошт адпявання па прычыне таго, што некаторыя ксяндзы выстаўлялі свае расцэнкі [7, арк. 2—2 адв.]. У 1903 годзе кс. Юргевіч (імя не пазначана), які быў на той час ужо вызвалены з пасады Капыльскага пробашча, спрабаваў вывезці азімыя, сена і салому з амбара касцёла ў Капылі, на што не меў права. Аб дадзеным выпадку дзеючы святар паведаміў дэкану, у выніку кс. Юргевічу вынесена папярэджанне [3, арк. 81].

Увага ў службовай перапісцы паміж дэканам і парафіяльнымі святарамі надавалася пытанням нерухомай маёмасці. Пасля падаўлення паўстання 1863—1864 гадоў пашырыліся

выпадкі адчужэння зямель каталіцкіх парафій на карысць праваслаўных прыходаў. Дэканы адпраўлялі ксяндзам лісты, у якіх папярэджвалі аб неабходнасці правядзення землямерных прац, чарчэння дакладных парафіяльных схем і завярэння дадзеных схем у паўнамоцных органах. Так, у Ішчальнскай парафіі ў 1880 годзе адбылася спрэчка са святаром Дзікушскага прыхода за урочышча Готараўшчызна памерам 1 дзесяціну 1 660 сажняў. У парафіі не аказалася схемы зямельных надзелаў, зямля была перададзена праваслаўным, а схема складзена пазней, у 1888 годзе [8, арк. 1—12 адв]. Шэраг падобных выпадкаў меў месца ў парафіях Сноў, Поразава і інш. Дадзеныя лісты дазваляюць дакладна ўстанавіць межы парафіяльных тэрыторый, а таксама вызначыць з большай верагоднасцю, якія вёскі, фальваркі, урочышчы ўваходзілі ў кожную асобную парафію.

Матэрыялы перапіскі дазваляюць устанавіць уласную маёмасць, якая належала асобнаму парафіяльнаму святару. У большасці выпадкаў ксёндз меў невялікую колькасць рэчаў, набытых ім ва ўласнасць. Напрыклад, кс. Брасевіч з парафіі Вязынка завяшчаў усю набытую ім маёмасць пасля смерці ахвяраваць тым святарам, якія маюць патрэбу ў пакінутых прадметах. У выніку па завяшчанні былі раздадзены працэсійны крыж, два белыя арнаты, два белыя дальматыкі, два кандэлябры на пяць свечак, абраз Св. Антонія [3, арк. 97].

Аналіз захаванай уваходнай ад дэканаў карэспандэнцыі дазваляе выявіць эпідэміі хваробаў, якія распаўсюджваліся на тэрыторыях Беларусі ў пачатку XIX — пачатку XX стагоддзя Так, лісты да Белагрудскага пробашча, датаваныя лістападам 1830 года, сведчаць аб эпідэміі халеры на Лідчыне. У перапісцы дэкан даваў падрабязныя інструкцыі аб тым, як выявіць захворванне, а таксама прасіў маліцца, каб эпідэмія сыйшла [9, арк. 3]. У 1914—1917 гадах па Шчучыншчыне распаўсюджвалася «іспанка», з-за якой памерла вялікая колькасць асоб (аб дакладнай колькасці ў лісце не паведамляецца) [10, арк. 5 адв.].

Частка перапіскі, выяўленай у парафіяльных касцёлах, прысвечана пытанням набыцця літургічных кніг, уступленню на пасаду новых дэканаў, парадку набажэнстваў і суплікацый у пэўныя дні, збору ахвяраванняў на Чырвоны Крыж і вайсковыя патрэбы, рамонту парафіяльных будынкаў і шмат інш.

Адным з узроўняў службовай перапіскі парафій з'яўляецца ліставанне святароў аднаго рангу. Вялікая колькасць уваходных лістоў, якія захаваліся ў парафіяльных касцёлах — гэта лісты пробашчаў іншых парафій: пасведчанні аб канфесійнай прыналежнасці, звесткі аб змене месца жыхарства вернікаў, выпіскі з метрычных кніг, метрычныя пасведчанні аб шлюбе, пахаванні, смерці. Значную колькасць матэрыяла ў дадзеным выпадку складаюць пасведчанні аб канфесійнай прыналежнасці ці даведкі аб яе вызначэнні. У шэрагу выпадкаў пасведчанні запытвалі не толькі ў ксяндзоў-пробашчаў, але і ў праваслаўных святароў. Дадзеныя дакументы высылаліся, калі вернік пераязжаў з адной парафіі ў іншую, і ксяндзу-пробашчу былі неабходны гарантыі, што асоба не мае ніякіх перашкод для правядзення над ёй Сакрамэнтаў. Так, у 1834 годзе поразаўскім ксяндзом быў зроблены запыт на вызначэнне канфесіі селяніна в. Церашковічы (Гарнастаевіцкі праваслаўны прыход) Мірона Шаботніка, у адказ на што Гарнастаевіцкі настаяцель Іосіф Васінскі напісаў, што М. Шаботнік за апошнія два гады не быў заўважаны на споведзі, адпаведна, яго веравызнанне невядомае і запісана як «праваслаўнае» быць не можа [11, арк. 13—14 адв.]. У 1911 годзе пробашч парафіі Белагруда звярнуўся да ксяндза Лідскай Фары Юзэфа Шкопа на прадмет наяўнасці кананічных перашкод да шлюбу паміж жыхаром Ліды В. Букаткам і жыхаркаю Белагруды С. Гурначовай, на што быў дадзены адказ аб тым, што жаніх ахрышчаны, наведвае споведзі, таму перашкод для шлюбу не маецца. У сваю чаргу настаяцель Жалудоцкага касцёла бачыў кананічную перашкоду ў шлюбе паміж С. Сушко і А. Гольцавай па той прычыне, што жаніх не быў на прычашчэнні [12, арк. 1—1 адв.]. У выпадку, калі вернік паміраў далёка ад месца хрышчэння, яго маглі адпець і пахаваць па месцы смерці, даслаўшы ў касцёл ліст з прылажэннем да яго выпіскі з метрычнай кнігі. Напрыклад, 10 сакавіка 1864 года ў Калузе памёр рыма-каталік Анджэй Лось з вёскі Макашаў

Паланэчскай парафіі. А. Лось быў адпеты праваслаўным святаром і пахаваны, аб чым да ксяндза быў дасланы адпаведны ліст [13, арк. 148а]. Дзякуючы памянёным лістам, становіцца магчымым аналізаваць геаграфічную мабільнасць у мікралакацыях.

**Заключэнне.** Выяўленыя ў парафіяльных касцёлах матэрыялы перапіскі з'яўляюцца каштоўнай крыніцай па гісторыі арганізацыйных зносін і кіравання парафіямі ў Рымска-каталіцкай інстытуцыі. Ліставанне дапамагае аналізаваць мікрагістарычны аспект, які заключаецца ў наяўнасці ў крыніцах вялікай колькасці інфармацыі аб дзейнасці парафій, у тым ліку аб пытаннях верыфікацыі запісаў метрычных кніг і фальсіфікацыі метрык; парушэннях нормаў і правілаў органаў духоўнай улады канкрэтнымі пробашчамі; пазбаўленні ксяндзоў права святадзейства; геаграфічнай мабільнасці парафіян; эпідэміях хвароб; рэлігійным і цывільным жыцці.

### Спіс цытаваных крыніц

1. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (далей — ЦНА НАН Беларусі). — Ф. 3. С. Воп. 18. Спр. 1.
2. ЦНА НАН Беларусі. — Ф. 3С. Воп. 18. Спр. 5.
3. ЦНА НАН Беларусі. — Ф. 3С. Воп. 28. Спр. 2.
4. ЦНА НАН Беларусі. — Ф. 3С. Воп. 2. Спр. 39.
5. ЦНА НАН Беларусі. — Ф. 3С. Воп. 21. Спр. 1.
6. Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы (далей — ДГАЛ). — Ф. 604. Воп. 1. Спр. 7507.
7. ДГАЛ. — Ф. 694. Воп. 3. Спр. 234.
8. ЦНА НАН Беларусі. — Ф. 3С. Воп. 2. Спр. 42.
9. ЦНА НАН Беларусі. — Ф. 3С. Воп. 4. Спр. 4.
10. ЦНА НАН Беларусі. — Ф. 3С. Воп. 2. Спр. 54.
11. ЦНА НАН Беларусі. — Ф. 3С. Воп. 10. Спр. 10.
12. ЦНА НАН Беларусі. — Ф. 3С. Воп. 2. Спр. 53.
13. ЦНА НАН Беларусі. — Ф. 3С. Воп. 18. Спр. 9.

Паступіў у рэдакцыю 31.08.2018